# МІНСК ЯК СІМВАЛ ДЫЯЛОГУ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся ўчора з намеснікам Генеральнага сакратара ААН — выканаўчым сакратаром Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН Крысціянам Фрыісам Бахам, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў важнасць таго, што Крысціян Фрыіс Бах не ўпершыню наведвае нашу краіну, і ў яго склалася сваё меркаванне пра Беларусь.

Што датычыцца дзейнасці Еўрапейскай эканамічнай камісіі, у рабоце якой удзельнічаюць 56 дзяржаў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Вашы праекты і даследаванні ў многіх галінах і, перш за ўсё, у эканоміцы, экалогіі, інавацыях, сферы транспарту, будаўніцтва, сацыяльнай сферы, прыватна-дзяржаўным партнёрстве ўносяць вялікі ўклад у развіццё нацыянальных праграм па адпаведных напрамках».

«Больш таго, мне прыемна з вамі сустракацца яшчэ і таму, што вы — чалавек, які прыхільны да гэтых напрамкаў, блізкі да зямлі, вельмі цэніце прыроду і развіваеце гэту прыроду», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тэму прыродаахоўнай дзейнасці. «Вядома, мы надаём вялікае значэнне гэтым пытанням. У Парыжы заключылі адпаведнае міжнароднае пагадненне. Гэта вялікая перамога, у тым ліку вялікі ўклад Еўрапейскай эканамічнай камісіі, — лічыць Прэзідэнт. — Але ўсё ж такі мы, напэўна, яшчэ да канца не ўсведамляем тое, што можа адбыцца з планетай і чалавецтвам, калі па-варварску будзем ставіцца да гэтых пытанняў, калі мы не будзем сістэмна падыходзіць да вырашэння многіх праблем, у тым ліку па гэтых напрамках, па якіх працуе ЕЭК. Таму наперадзе ў нас вельмі вялікі шлях, які мы павінны прайсці».

Беларусь гатова падзяліцца сваім вопытам прыродаахоўнай дзейнасці, у тым ліку ў час намечанай на 2017 год у Мінску канферэнцыі краін — удзельніц Канвенцыі ЕЭК ААН аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў трансгранічным кантэксце.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пытанні прыродаахоўнай дзейнасці вельмі важныя для ўсіх краін. «Таму тымі даследаваннямі, навацыямі, якія вы праводзіце, вы ўзбагачаеце планету», — перакананы кіраўнік дзяржавы. «Мы сёння тут спрабуем выбудаваць дыялог на ўзаемавыгадных умовах, гаворым пра «інтэграцыю інтэграцый». Вопыт ярка дэманструе, што зараз не час будаваць межы, сцены, а трэба якраз наладжваць адкрыты, даверны дыялог».

У сваю чаргу Крысціян Фрыс Бах заявіў, што Мінск стаў сімвалам дыялогу ў самыя складаныя часы. Ён падкрэсліў важнасць правядзення ў Мінску гэтай канферэнцыі ЕЭК ААН.

Кіраўнік ЕЭК падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за ініцыятыву Беларусі па прасоўванні ідэі дыялогу і камунікацый ва ўсім свеце, ён таксама адзначыў лідзіруючую ролю Беларусі ў аб'яднальных працэсах, у дзейнасці ЕЭК, а таксама звярнуў увагу на развіццё, якое дэманструе Беларусь па многіх напрамках.

ЕЭК ААН — адна з пяці рэгіянальных эканамічных камісій ААН. Створана ў сакавіку 1947 года, штаб-кватэра размешчана ў Жэневе (Швейцарыя). У склад ЕЭК уваходзяць 56 дзяржаў, уключаючы краіны Еўропы, ЗША, Канаду, Ізраіль і ўсе постсавецкія дзяржавы.

Беларусь з'яўляецца паўнапраўным членам ЕЭК ААН з моманту яе стварэння. Узаемадзеянне з камісіяй курыруе Міністэрства эканомікі. Прыярытэты супрацоўніцтва з ЕЭК ААН — спрашчэнне гандлю, транспарт, энергетыка, інавацыі, экалогія.

■ Сувязі

## Перамовы аб Мытным кодэксе працягнуцца

### Мінск прымае кіраўнікоў урадаў Еўразійскага эканамічнага саюза

Учора падчас сустрэчы прэм'ер-міністраў ЕАЭС (Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі) была прадстаўлена справаздача аб выкананні бюджэту за 2015 год і ўхвалены бюджэт на 2017-ы. Прэм'еры разгледзелі Мытны кодэкс Еўразійскага эканамічнага саюза. Па чатырох пунктах з 10, якія планавалася ўзгадніць, была дасягнута дамоўленасць. На наступным пасяджэнні Міжурадавага савета, які адбудзецца ў сярэдзіне лістапада ў расійскай сталіцы, плануецца канчаткова вырашыць гэта пытанне і падпісаць дакумент. Таксама прэм'еры абмеркавалі стварэнне агульнага рынку лекавых сродкаў ЕАЭС, канчатковае рашэнне па якім будзе прынята ў лістападзе.

«Не так актыўна, як хацелася б, ідзе рух насустрач у пытаннях рэалізацыі ўзгодненай сельскагаспадарчай палітыкі, зняцця бар'ераў на рынку, — адзначыў **прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ** на пашыраным пасяджэнні Міжурадавага савета ЕАЭС. — Ва ўрад паступаюць запыты прадпрыемстваў і арганізацый аб асабліасцях працы на рынках краін саюза ў сучасных умовах, доступе да дзяржаўных закупак, арганізацыі транзіту і многіх іншых тэмах».

Акрамя таго, кіраўнікі ўрадаў закранулі пытанні кантролю за перамяшчэннем тавараў на тэрыторыі саюза, прымянення антыдэмпінгавых мер, міжнароднай дзейнасці Еўразійскай эканамічнай камісіі, а таксама аб прадаўжэнні тэрмінаў дзеяння пілотнага праекта па ўвядзенні маркіроўкі тавараў ідэнтыфікацыйнымі знакамі.

Сёння ў Нацыянальнай бібліятэцы, адбудзецца Савет кіраўнікоў урадаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў, а таксама сустрэча на ўзроўні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. На парадку дня міжурадавага Савета СНД — 20 праектаў дакументаў, амаль кожны другі з якіх накіраваны на паглыбленне і пашырэнне ўзаемадзеяння ў эканамічнай сферы.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Дэмаграфія

# ПРЫРАСТАЕМ!

**Упершыню за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі ў нас назіраецца натуральнае павелічэнне колькасці насельніцтва**



**Як заявіла ўчора намеснік начальніка аддзела народанасельніцтва, гендэрнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА, гэта гістарычны факт, што ўпершыню за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі ў нашай краіне назіраецца натуральны прырост колькасці насельніцтва. Паводле яе слоў, гэта вынік ўзаемазвязаных фактараў, асноўнымі з якіх з'яўляюцца рост нараджальнасці і зніжэнне смяротнасці, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Прадстаўнік ведамства звярнула ўвагу, што на рост нараджальнасці ў Беларусі ў першую чаргу паўплывалі комплексныя паслядоўныя меры дзяржаўнай палітыкі. «На ўзроўні кіраўніка дзяржавы, урада ў апошнія гады быў прыняты шэраг кардынальных мер, накіраваных на стварэнне спрыяльных умоў для нараджэння і выхавання дзяцей у сем'ях. У Беларусі з 2007 года рэалізуецца ўжо трэцяя праграма дэмаграфічнай бяспекі», — нагадала яна.

Сярод іншага Марына Арцёменка паведаміла, што ў краіне дзейнічае разгалінаваная сістэма дзяржаўных дапамог, якая ўвесь час развіваецца. Пры гэтым у апошнія гады значна павялічаны памеры дапамог — напрыклад, у 2013 годзе ў два разы выраслі дапамогі па доглядзу дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Істотнымі таксама з'яўляюцца памеры аднаразовых дапамог у сувязі з нараджэннем дзяцей, і гэтыя дапаможнікі вельмі істотныя ў параўнанні з краінамі СНД і ЕАЭС.

Спецыяліст таксама нагадала, што ў 2015 годзе ў Беларусі пачала дзейнічаць маштабная сістэма доўгатэрміновай падтрымкі шматдзетных сем'яў — сямейны капітал. За перыяд дзеяння сямейнага капіталу адкрыта больш за 25 тыс. дэпазітных рахункаў. Мінпрацы лічыць, што дзякуючы ў тым ліку і гэтаму ў краіне паступова павялічваецца колькасць шматдзетных сем'яў. Так, калі параўноўваць з дадзенымі перапісу 2009 года, калі налічвалася 62,5 тыс. шматдзетных сем'яў, цяпер іх колькасць перавысіла 85 тысяч. Акрамя таго, павялічваецца колькасць дзяцей, якія нарадзіліся трэцімі і наступнымі. У 2015 годзе доля дзяцей, якія нарадзіліся ў сем'ях трэцімі, склала больш за 16%.

«Актыўныя меры сацыяльнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі знаходзяць водгук у насельніцтва. У 2015 годзе ў нас нарадзілася рэкордная колькасць дзяцей — 119 тыс. Нягледзячы на зніжэнне колькасці жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту (назіраецца з 2013 года), рост нараджальнасці працягвае радаваць, і за 9 месяцаў бягучага года з'явілася на свет ужо больш за 89 тыс. дзяцей, што таксама больш, чым колькасць дзяцей, народжаных за аналагічны перыяд папярэдняга года», — канстатавала Марына Арцёменка.

Гаворачы аб магчымым змене заканадаўства, што датычыцца выплаты дапамог, намеснік начальніка аддзела адзначыла, што сёлета падрыхтаваны і ўнесены ў Палату прадстаўнікоў законапраект, які выкладае закон аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, у новай рэдакцыі. У прыватнасці, гэтым дакументам уводзяцца новыя меры па ўзмацненні сацыяльнай абароны сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. «Сёння дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда прызначаецца непрацуючым асобам. Дык вось, у такіх асоб з'явіцца магчымасць працаваць па працоўнай дамове або на даму, на ўмовах няпоўнай занятасці, і адначасова атрымліваць дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда», — патлумачыла Марына Арцёменка.

Яна таксама дадала, што ў сусветным рэйтынгу па ўмовах мацярынства Беларусь займае 25-е месца з амаль 180 краін свету і першае месца сярод дзяржаў СНД ■

■ Дзяржава і бізнес

# Пазіцыі палепшыліся

**Беларусь на 37-м месцы ў рэйтынгу Doing Business — 2017**

**Наша краіна заняла 37 месца ў рэйтынгу «Вядзенне бізнесу — 2017». Даследаванне сёлета праводзілася сярод 190 дзяржаў. У мінулым годзе ў гэтым рэйтынгу краіна займала 44 пазіцыю. Аднак пасля перагляду вынікаў у сувязі са з'яўленнем больш дакладных даных ад краін, якія прымалі ўдзел у даследаванні, лічыцца, што Беларусь займала ў справаздачы «Doing Business — 2016» не 44-ы, а 50-ы рэйтынгавы радок.**

Сёлета рэйтынг узначаліла Новая Зеландыя, пасунуўшы Сінгапур на другое месца. У топ-10 краін з найбольш спрыяльнымі ўмовамі для прадпрымальніцкай дзейнасці таксама трапілі Данія, Ганконг (спецыяльны адміністрацыйны раён Кітая), Рэспубліка Карэя, Нарвегія, Вялікабрытанія, ЗША, Швецыя і Македонія. На постсавецкай прасторы самае высокае месца займае Эстонія — 12-е. Следам за ёй на 14 месцы Латвія, на 16-м — Грузія, Літва — на 21-м. Казахстан заняў 35 месца, Арменія — 38-е, Расія — 40-е, Малдова — 44-е, Азербайджан — 65-е, Кыргызстан — 75-е, Украіна — 80-е, Узбекістан — 87-е, Таджыкістан — 128-е.

У гэтым дакладзе ўлічваліся рэформы, якія праводзілі ў перыяд з 2 чэрвеня 2015 года па 1 чэрвеня 2016 года. За гэты перыяд Беларусь ажыццявіла чатыры значныя рэформы, якія спрашчаюць вядзенне бізнесу. Краіна спрасціла працэдуру падключэння да сістэмы электразабеспячэння за кошт укаранення прынцыпу «аднаго акна» ў службе, якая займаецца ўсімі пытаннямі гэтай сістэмы, у тым ліку праектаваннем і будаўніцтвам размеркавальных сетак. Таксама спрасціліся працэдуры перадачы маёмасці за кошт узмацнення празрыстасці і надзейнасці сістэмы кіравання зямельны рэсурсамі. Сёння для рэгістрацыі ўласнасці неабходна прайсці толькі дзве працэдуры і выдаткаваць тры дні, што дазволіла краіне выйсці на пятае месца ў свеце па паказчыку «Рэгістрацыя ўласнасці». Акрамя таго, была створана сістэма крэдытных гісторый, і Бюро крэдытных гісторый пачало прысвойваць ацэнкі крэдытаздольнасці пазычальнікаў. Краіна таксама зрабіла крокі, каб умацаваць абарону правоў мінарытарных інвестараў, тым самым гарантуючы прававу абарону ў выпадках, калі аперацыі звязаных бакоў наносяць кампаніі шкоду. Таксама ўзмацніліся патрабаванні да карпаратыўнай празрыстасці.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by* ■

■ Без закрытых тэм

# ІНТЭГРАЦЫЯ. ДАВЕР. ПАРАЗУМЕННЕ

## Міжнародная канферэнцыя ў Мінску сабрала палітыкаў з Еўропы і Азіі

**Тэмай яе сталі агульнаеўрапейскія інтэграцыйныя працэсы. Ці не кожны выступоўца падкрэсліў важнасць адкрытага дыялогу для мірнага жыцця рэгіёнаў. Удзел у мерапрыемстве прынялі прадстаўнікі Міністэрства замежных спраў нашай краіны, Еўразійскай эканамічнай камісіі, Еўрапейскага саюза, а таксама дэлегаты экспертнай супольнасці розных краін.**

**Яўген ШАСТАКОЎ, намеснік міністра замежных спраў,** падкрэсліў, што МЗС не чакае ад экспертаў «цуду» або чароўных рэцэптаў і імгненных вынікаў.

— Але мы заўсёды ўдзячны за іх унёсак у пошук рашэння актуальных і надзёных праблем, — дадаў намеснік міністра. — Мне здаецца, агульнаеўрапейская інтэграцыя сёння мае лёсавызначальнае, ключавое значэнне не толькі ў рэгіянальным, але і ў глабальным маштабе. Прычым мы адзначаем наяўнасць класічнага парадоксу: з аднаго боку існуе пастаянны запыт на інтэграцыю, з іншага — шэраг праяўленняў канфрантацыі, размежавання. Такую супярэчнасць можна патлумачыць тым, што мы каторы раз за апошнія дзесяцігоддзі з пэўнай рэгулярнасцю апынуліся на чарговым «піку» змены парадыгмы светаскладу. Але гэта далёка не адзінае тлумачэнне.

Па словах намесніка міністра замежных спраў, сучасны парадак дня перагружаны геапалітычным супрацьстаяннем.

**Таццяна ВАЛАВАЯ, член калегіі (міністр) Еўразійскай эканамічнай камісіі па асноўных кірунках інтэграцыі і макраэканоміцы,** адзначыла, што мадэль Еўразійскага эканамічнага саюза будавалася на аснове вопыту еўрапейскай інтэграцыі.

— На працягу 90-х гадоў мы атрымлівалі велізарную падтрымку ад Еўрапейскага саюза па выпрацоўцы падыходаў да еўразійскай інтэграцыі: экспертную, прафесійную, тэхнічную, фінансавую, — звярнула ўвагу яна. — Усе дакументы, якія мы рыхтавалі па лініі Садружнасці Незалежных Дзяржаў, па дагаворы аб эканамічным і валютным саюзе, які мы падпісалі ў 1993 годзе, — рыхтаваліся з удзелам еўрапейскіх экспертаў. Мы заўсёды сыходзілі з таго, што наша еўразійская інтэграцыя, па сутнасці, у якасці сваёй мадэлі выкарыстоўвае еўрапейскі вопыт.

У наступным годзе Беларусь будзе старшынстваваць у рэгіянальнай арганізацыі — Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятыве. **Намеснік Генеральнага сакратара гэтага аб'яднання Маргот КЛЕСТЫЛЬ-ЛЁФНЕР**, якая таксама прыняла ўдзел у канферэнцыі, звярнула ўвагу на важнасць трансгранічнага супрацоўніцтва. Што да вырашэння тых сур'ёзных праблем, якія паўсталі сёння ў адносінах паміж Еўрапейскім, Еўразійскім эканамічным саюзамі, то, на яе думку, неабходна «аднаўляць давер». Маргот Клестыль-Лёфнер падкрэсліла, што гэта дапаможа ў тым ліку павысіць узровень бяспекі ў рэгіёне.

* * *

Экспертная ініцыятыва «Мінскі дыялог» запрацавала ў сакавіку 2015 года як пазаўрадавы форум па тэматыцы міжнародных адносін і бяспекі на еўрапейскім кантыненце. З моманту стварэння ініцыятывы ў яе рамках прайшлі чатыры паспяховыя міжнародныя канферэнцыі. Яны сабралі ў Мінску вядучых экспертаў з Еўрапейскага саюза, Злучаных Штатаў Амерыкі, Расіі, іншых дзяржаў Усходняй Еўропы. У рабоце канферэнцый прымалі ўдзел і высокапастаўленыя афіцыйныя асобы нашай краіны і замежжа.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by* ■